16. НГА РБ, ф. 295, воп. 1, спр. 1627.
17. НГА РБ, ф. 295, воп. 1, спр. 1511.

SUMMARY

*This article is about the influence of the uprising in 1863—1864 in Poland, Lithuania, Belarus on the origins and development of the institutions of the peasant selfgovemment on the Belarusian lands.*

УДК 947.6

*А. П. Жытко*

# Развіццё малочнатаварнай жывёлагадоўлі ў дваранска-памешчыцкіх гаспадарках Беларусі (1861—1914 гг.)

Адным з напрамкаў развіцця сельскай гаспадаркі з'яўлялася малочнатаварная жывёлагадоўчая вытворчасць. Але ў першыя дзесяцігоддзі пасля скасавання прыгону яна, як і іншыя галіны памешчыцкай гаспадаркі, прыйшла ў заняпад. Статкі пародзістых кароў паменшыліся, паколькі для іх даглядання патрабаваліся значныя сродкі (павышэнне кошту рабочай сілы, няздольнасць большасці памешчыкаў арганізаваць гаспадарку ў новых умовах, памяншэнне абаротнага капіталу, кантрыбуцыі і г. д.). У архіўных крыніцах, справаздачах губернатараў, навуковых даследаваннях таго часу існавалі толькі фрагментарныя звесткі аб тым, што ў таго ці іншага памешчыка арганізавана правільная сістэма малочнатаварнай вытворчасці. Па сутнасці ў гэтыя гады былі асобныя аазісы, дзе ў гаспадарках утрымліваліся замежныя высокапародзістыя малочныя каровы, ці арганізавана праводзіліся селекцыйныя мерапрыемствы па ўдасканаленні мясцовай пароды буйной рагатай жывёлы.

У 60—70-х гг. палепшаныя пароды жывёлы наглядаліся толькі ў некаторых вельмі буйных памешчыцкіх гаспадарках (у асноўным рускіх дваран, на якіх не паўплывалі падзеі 1863 г.). Так, гэта тычыцца маёнткаў князя Варшаўскага ў Гомельскім павеце, графаў Талстога і Чарнышова-Круглікава ў Чавускім і Рагачоўскім паветах, вядомага маёнтка Шчорсы Навагрудскага павета, графа Храптовіча і некаторых іншых [1, с. 90—91]. «Паляпшэнне парод буйной рагатай жывёлы наглядалася толькі ў Слуцкім і Навагрудскім паветах», — адзначаў статкамітэт Мінскай губерні ў 1865 г. [2].

цэлым у 60—70-х гг. жывёлагадоўля ў памешчыцкіх гаспа-
х Беларусі, тым больш у сялянскіх, насіла «гнаявы» харак-
Іля яе непатрэбны былі пародзістыя каровы, якім неабход-
ылі значныя выдаткі на ўтрыманне. Менавіта таму «буйная
ая жывёла належыць пераважна да звычайнай мясцовай па-
Знешні выгляд беларускай каровы мае шэраг недахопаў:
вельмі малы (ад 1 арш. 8 вярш. да 1 арш. 10 вярш.). Нярэд-
га дарослай каровы не больш 7—8 пудоў. Малочнасць у ка-
азвіта слаба, хаця масла тлустае, густое. У сярэднім карова
а адзін дзень малака ад 2 да 4 кварт альбо 20—40 вёдзер у
Але парода гэта, па здольнасці пераносіць нягоды, задаваль-
ца невялікай колькасцю корму, словам церпіць голад і хо-
далёка пераўзыходзіць усе заходнееўрапейскія пароды»
871].
а гэтай прычыне ў першае дваццацігоддзе пасля скасавання
эну буйная рагатая жывёла і яе прадукты ішлі «на збыт у
ічных памерах і толькі ў памешчыкаў». У прыгарадных ма-
іх каровы здаваліся «ў пакт яўрэям па 10—12 руб. за штуку
па 24 кап. за вядро малака. Пры гэтым выручалася па
б. за карову; але і без здачы ў пакт удой ад каровы
осіць 10—12 руб.» [4, с. 88]. Толькі ў тых маёнтках, што
дзіліся ад гарадоў ці былі звязаны з імі зручнымі шляхамі
н, у большай ступені развівалася малочная гаспадарка,
укты якой збываліся на мясцовых рынках. У аддаленых
тках звычайна загатоўвалі масла, сухі тварог і сыр [5, с. 25].
олькі з пачаткам аграрнага крызісу, ростам гарадскога на-
іцтва, пабудовай новых чыгунак, шашэйных дарог, прамы-
ым уздымам 90-х гг. у дваранска-памешчыцкай гаспадарцы
ідаецца паступовы пераход да малочнатаварнай вытворчасці
дной з галоўных галін. Сведчаннем таму з'яўляюцца як
важдачы губернатараў, так і шэраг іншых фактаў і сведчан-
Так, Віленскі генерал-губернатар у аглядзе за 1893 г. адзна-
што «вельмі забяспечаны збыт прадуктаў жывёлагадоўлі ў
м рэгіёне вымушае памешчыкаў звяртаць належную ўвагу
рыманне жывёлы, інтэнсіўнае яе кармленне за кошт трава-
ія і культуры караняплодаў... Дзякуючы ўзмоцненаму раз-
нню пераважна буйной рагатай жывёлы, у тутэйшых маёнт-
пачынае развівацца і малочная гаспадарка, арганізаваная на
ш рацыянальных пачатках. Наогул, у апошнія часы ў ма-
ай гаспадарцы ў нас не наглядалася амаль ніякіх тэхнічных
каналенняў і толькі не так даўно, на працягу апошняга
цігоддзя, сыраварства і масларобства... сталі набываць
ш важнае значэнне і прыносіць большую карысць сельскай
дарцы. Яны даюць масу прадуктаў не толькі для ўнутра-
спажывання, але і для знешняга вывазу. Нанава тут на

ўзнікшых сыраварнях і маслабойнях пачалі працаваць добра падрыхтаваныя майстры, якія выробляюць сыры, падобныя на замежныя. Пры гэтым сыры на мясцовых рынках канкурыруюць з замежнымі і выцясняюць іх» [6, с. 69].

Для паляпшэння статка дойных кароў у 80—90-х гг. у буйных памешчыцкіх маёнтках усё больш узнікаюць «заводы» па развядзенні замежных парод. У гэты час вядомымі расаднікамі былі маёнтак Лужкі графа А. Плятар-Зыбера (ангельская, альгаўская, остфрысланская пароды), маёнтак Франаполь Ялавіцкага (альдэнбургскія метысы), Дзісненскага павета Віленскай губ.; маёнтак Падблонь Макавай (альгаўская і яраслаўская) Ігуменскага, маёнтак графа Кейзярлінга ў г. Барысаве (галандская) Мінскай губ.; маёнткі наследнікаў М. Папова ў в. Забалоцце-Баран (ангельская) Аршанскага павета, Кухлярскай у в. Ляўкі (сіментальская і альгельская) Горыцкага павета Магілёўскай губерні і інш. [7, с. 91].

Прыдбанне памешчыкамі замежнай буйной рагатай жывёлай спрыяла не толькі распаўсюджанню яе ў іншых гаспадарках, але і правядзенню селекцыйнай работы шляхам скрыжоўвання з мясцовай беларуска-літоўскай пародай. Адным з вядомых селекцыянераў і папулярызатараў беларуска-літоўскай пароды ў Беларусі з'яўляўся ўладальнік маёнтка Ігнацічы дваранін В. Ельскі. У 1902 г. у маёнтку ўтрымлівалася 40 дойных кароў гэтай пароды, якія ў сярэднім у год давалі па 125 вёдзер малака. З асобных кароў надойвалі па 207—250 вёдзер [8, 1902, № 3, с. 61]. У 1914 г. на Усерасійскай выстаўцы ў Маскве ўпершыню была прадстаўлена беларуска-літоўская парода кароў. У прыватнасці — 3 каровы і 1 бык В. Ельскага і карова з маёнтка Глівін Барысаўскага павета памешчыка Фл. Свіды. Спецыялісты зацікавіліся гэтай пародай і рэкамендавалі яе да далейшага паляпшэння. Пры гэтым бык В. Ельскага і карова Фл. Свіды былі ўзнагароджаны вялікім срэбным медалём, а тры каровы В. Ельскага — малым срэбным медалём [9, № 6, с. 13].

В. Ельскі так характарызаваў беларуска-літоўскую пароду: «Калі не глядзець на знешнюю прыгажосць жывёлы, але імкнуцца па магчымасці больш танна атрымаць гарнец малака, то мясцовая жывёла па колькасці малака саступае толькі галандскай пародзе. Але калі ўзяць пад увагу колькасць тлусту, кошт утрымання і дагляданья, то яна ідацць перасягне ўсе разводзімыя ў нас заходнееўрапейскія пароды» [8, 1903, № 3, с. 62]

З мэтай селекцыі кароў, падбору адпаведна мясцовым патрэбам на пачатку XX ст. памешчыкі пачалі арганізоўваць кантрольныя саюзы. Створаны ў 1912 г. Гродзенскі саюз жывёлаводчыкаў і жывёлазаводчыкаў паставіў задачы: 1) падбор жывёлы адпаведна патрабаванням рацыянальнага жывёлагадоўлі; 2) рэ-

істрацыя чыстакроўнай і паўкроўнай жывёлы; 3) пасрэдніцтва ры закупцы і продажу членам саюза племянной жывёлы і інш. 10, с. 132]. У 1913 г. да гэтага саюза далучыліся памешчыкі Сувалкаўскай губерні і часткі Віленскай губерні. Пад кантролем аюза знаходзілася 4 тыс. галоў жывёлы. Савет саюза вырашыў равесці масавае абследаванне парод буйной рагатай жывёлы Гродзенскай губерні і адкрыць курсы даглядчыкаў жывёлы ў маёнтку Астравок каля Гродна [11, с. 103—104]. У 1914 г. Мінскай губерні існавалі 3 памешчыцкія і 1 сялянскі кантрольныя саюзы ўладальнікаў толькі беларуска-літоўскай пароды жывёлы [9, № 7, с. 32]. Летам 1912 г. яны разам з губернскім земствам правялі абследаванне літоўска-беларускай жывёлы як у прыватных, так і сялянскіх гаспадарках губерні [12, с. 3—4, 10]. У маі 1914 г. быў створаны Магілёўскі губернскі кантрольны саюз [13, с. 40].

Такім чынам, паляпшэнне статка дойных кароў не магло не казацца на павышэнні ўдояў. Калі ў 60—70-х гг. памешчыцкія каровы ў сярэднім у год давалі 23—60 вёдзер малака, у 90-х — да 70, то ў 1910—1914 гг. толькі ад беларуска-літоўскай пароды надойвалі 130 вёдзер пры тлустасці 4,28 % [1, с. 96].

Калі ў першае дваццацігоддзе пасля скасавання прыгону ў ых нязначных па колькасці маёнтках, дзе ўтрымліваліся дойныя каровы, малако перапрацоўвалася на масла і сыры, то з канца XIX ст. з'явілася магчымасць пастаўляць ужо малако, смятану, вяршкі на вялікую адлегласць ад раёнаў іх вытворчасці. Справа ў тым, што на чыгунках Беларусі з'явіліся спецыяльна бсталяваныя вагоны — вагоны-лядоўнікі. У прыватнасці, даследчык развіцця малочнай вытворчасці таго часу А. А. Радцыг ісаў: «У паўночна-заходніх губернях у выніку паляпшэння спосабаў перавозкі малочных прадуктаў па чыгунках, малочная гаспадарка набыла больш важнае значэнне, чым раней» [14, с. 37].

Невыпадкова ў пастанове Гродзенскага камітэта аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці адзначалася, што «для развіцця жывёлагадоўлі і малочнай гаспадаркі пажадана... абсталяванне ў значным памеры вагонаў-лядоўнікаў для перавозкі леам мяса і малочных прадуктаў» [15, с. 236—237].

Аб шпаркім развіцці малочнатаварнай гаспадаркі ў пачатку XX ст. сведчыць і факт, што сельскагаспадарчыя таварыствы, а пазней і земствы пачалі ствараць школы, праводзіць курсы па падрыхтоўцы спецыялістаў малочнай вытворчасці. Відаць, адной першых школ малочнай справы ў Беларусі была жаночая школа, адкрытая ў 1899 г. у маёнтку Ждановічы Чавускага паета памешчыка Бехлі [8, № 22, с. 39]. Таварыства віцебскіх сельскіх гаспадароў у 1905 г. заснавала спецыяльную Хрусталёўкую школу малочнай гаспадаркі ў Дрысенскім павеце [16,

с. 10—11]. Магілёўскае таварыства сельскай гаспадаркі ў в. Пашкава арганізавала ў сакавіку 1912 г. курсы па малочнай вытворчасці, а ў маі адправіла экскурсантаў у Данію і Швецыю для азнаямлення з вопытам у гэтай галіне [13, № 1—2, с. 47]. У 1912 г. у маёнтках Альбрэхтава і Селязні Полацкага павета былі арганізаваны курсы малочнай гаспадаркі [17, № 12, с. 247], а ў мястэчку Мір Навагрудскага павета іх закончылі 23 чалавекі з сялян [17, № 16, с. 328]. У 1914 г. Давыд-Гарадоцкае сельскагаспадарчае таварыства выпрашыла заснаваць на хутары маёнтка Фон-Ото племянны завод і курсы па малочнай гаспадарцы [9, № 2, с. 31].

Аб інтэнсіфікацыі развіцця малочнай гаспадаркі сведчаць і факты, што памешчыкі ў пачатку XX ст. імкнуліся адкрыць лаўкі, саюзы па збыце і склады малочнай прадукцыі. Так, Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі быў створаны склад малочных прадуктаў у Варшаве, а Магілёўскім — у Кіеве. Пры гэтым, калі да 1902 г. збыт прадуктаў ішоў за мяжу, то цяпер прадукты малочнай жывёлагадоўлі збываліся ў асноўным у імперыі, дзе даходы перавышалі амаль у 1,5 раза ад замежнага продажу [8, 1902, № 28, с. 561, 563]. У 1902 г. у Мінску арганізавалася таварыства па збыце малочнай прадукцыі [8, 1903, № 1, с. 807].

Такім чынам, аналіз прыведзеных фактаў сведчыць, што 80—90-я гг. XIX ст. з'віліся пераломным пунктам у пераарыентацыі дваранска-памешчыцкай гаспадаркі з чыста збожжавай да жывёлагадоўчай. У апошняй адметную ролю адыгрывала малочнатаварная вытворчасць, якая ў пачатку XX ст. атрымоўвала ўсё больш рынкавы характар. Разам з тым нельга пагадзіцца з шэрагам беларускіх даследчыкаў, якія абсалютызуюць ролю малочнай вытворчасці ў краі. Як уяўляецца, зыходзячы з гістарыяграфічнага аналізу, першым, хто перабольшыў поспехі памешчыцкай малочнатаварнай вытворчасці, з'яўляецца Х. Ю. Бейлькін. У прыватнасці, у сваёй манаграфіі [18] і папярэдніх артыкулах ён пераводзіць абстрактна-тэарэтычныя магчымасці дойнага статка Беларусі ў абсалют. Аўтар указвае, што ў 1861—1865 гг. у 5 заходніх губернях сярэднегадавая вытворчасць склала 111, у 1866—1870 гг. — 113, у 1876—1880 — 134 тыс. пудоў масла. У канцы XIX ст. агульная таварная прадукцыя склала 500—650 тыс. пудоў масла і сыру [18, с. 72, 140]. У той жа час вядома, што для атрымання аднаго пуда масла неабходна было перапрацаваць 121 вядро малака. Так, у 1870 г. у 5 заходніх губернях налічвалася 594,2 тыс. дойных кароў. З іх на долю памешчыкаў прыпадала 163,4 тыс. (27,5 % ад статка было ў прыватнікаў). Гэта лічба можа быць паменшана ў сувязі з наступствамі паўстання 1863 г. Такім чынам, каб атрымаць у 60—70-х гг. у сярэднім 111 тыс. пудоў масла, неабходна было ўсё малако перапрацаваць

і прадукт: 594,2 тыс. кароў давалі ў сярэднім у год 22,6 вё-
малака і дзелім на 121 вядро. Такім чынам, гэта толькі тэа-
ная магчымасць.
азам з тым, усе крыніцы ўказваюць на тое, што на выраб
і цвёрдых сыроў ішло малако абсалютна памешчыцкіх
[4, с. 88], надоі з якіх у той час ваגаліся ад 23 да 60 вёдзер
і толькі вельмі ў рэдкіх маёнтках атрымлівалі больш. Зна-
163,4 тыс. кароў прыватнікаў маглі даць 3,8—9,8 млн пу-
малака ў год, з якога (калі ўсё перапрацоўвалі толькі на
) маглі атрымаць ад 30 да 80 тыс. пудоў, альбо ў сярэднім
с. пудоў. Разам з тым малако спажывалася як непасрэдна,
ў выглядзе вяршкоў, смятаны, тварагу і сыру. Толькі для
мання 1 пуда галандскага сыру неабходна было перапраца-
10,6—10,7 пудоў малака [8, 1903, № 43, с. 807]. Менавіта
лічбы, якія прыводзяцца Х. Ю. Бейлькіным аб вытворчасці
і іншых малочных прадуктаў можна знізіць як мінімум у
ы. На жаль, яго статыстычныя падлікі некрытычна пера-
алі ў іншыя манаграфіі і падручнікі па гісторыі Беларусі
яду капіталізму.
ерапрацоўка малочнай прадукцыі патрабавала ўдасканален-
сталявання і заснавання масларобчых і сыраварных заво-
Да 80-х гг., за рэдкім выключэннем, у крыніцах утрымліва-
звесткі аб іх існаванні [2, ст. 118, Ч.2, арх. 511—512]. Звы-
а масла і сыры выраблялі самым прымітыўным спосабам.
ныя заводы з сепаратарамі і іншымі прыстасаваннямі папа-
ь у афіцыйную статыстыку з пачатку 80-х гг. Так, у 1883 г.
саваны адзін такі завод з 2 рабочымі, які даваў прадукцыі
тыс. р. у год [19]. У Гродзенскай губерні іх налічвалася 7 з
касцю рабочых 50 чалавек, але сума вытворчасці складала
р. [20, с. 61].
бдаць, большасць такіх заводзікаў на пачатку ХХ ст. было
цэнтравана ў Гродзенскай губерні. Так, у 1912 г. тут дзейні-
27 заводаў па вытворчасці масла і сыру, якія вырабілі пра-
ыі на 44,1 тыс. р. [10, с. 132]. У гэтым жа годзе ў Магілёў-
губерні 7 заводаў з 22 рабочымі далі прадукцыі на суму
тыс. р. [21, с. 38—39]. Зразумела, гэта былі найбольш вядо-
заводы з паравымі катламі. Тыя ж маёнткі, дзе дабывалі
а і сыры з дапамогай механічных сепаратараў, прэсаў і г. д.,
ключаліся ў афіцыйную статыстыку. Так, па даных Вілен-
а статкамітэта ў губерні ў 1909 г. дзейнічалі толькі 2 заводы,
вырабілі прадукцыі ўсяго на 2600 р. [22]. У той жа час
кі ў беларускіх паветах гэтай губерні ў 1909 г. было вы-
ена масла на суму 78 736 р., а сыру — на 43 702 р., што ра-
склала 122 438 р. [22]. Такім чынам, статыстыка масларо б-
і сыраварных заводаў не адлюстроўвае ўзроўню развіцця

малочнай гаспадаркі. Яна з'яўляецца сведчаннем тэхнічнага прагрэсу ў гэтай сферы.

Арыентацыя памешчыцкай гаспадаркі на малочную вытворчасць мела вынікам не толькі павышэнне таварнасці гаспадаркі, далейшае развіццё ўнутранага і знешняга гандлю, але і спрыяла інтэнсіфікацыі ўсёй сельскагаспадарчай вытворчасці. Так, малочныя каровы рэдка прадаваліся ўвосень, і кошт на іх павышаўся. Для іх утрымання ў зімовы перыяд патрабаваўся запас якасных кармоў і пастаянных рабочых-даглядчыкаў. Невыпадкова з канца XIX ст. пашыраюцца пасевы тэхнічных культур (бульба, турнэпс і г. д.) і кармавых траў (канюшыны, вікі і інш.). Акрамя таго, рост гандлёвай жывёлагадоўлі пашыраў унутраны рынак на сродкі вытворчасці (прылады для апрацоўкі малака, пабудовы для жывёлы, палепшаныя землеробчыя прылады пры пераходзе ад трохполля да шматпольных севазваротаў і г. д.). Больш глыбокая перапрацоўка малака, з'яўленне масларобчых і сыраварных заводаў сведчыла аб тэхнічным прагрэсе і з'яўленні пастаянных рабочых новай галіны вытворчасці.

*Крыніцы, літаратура*


1. *Липинский В. П.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. Мн., 1978.
2. НГАБ, ф. 21, воп. 1, спр. 42. Ч. 1. Л. 14.
3. Опыт описания Могилевской губернии... Могилев, 1883. Кн. 2.
4. Несколько сведений о современном состоянии сельского хозяйства и промыслов в Гродненской губернии. Гродно, 1872.
5. Приложение ко всеподданейшему отчету Минского губернатора за 1875 год. Мн., 1876.
6. Обзор Виленской губерни на 1895 год. Вильня, 1894.
7. Памятная книжка Виленской губернии на 1895 год. Вильна, 1894.
8. Молочное хозяйство.
9. Вестник Минского губернского земства. 1914.
10. Обзор Гродненской губернии за 1912 год. Гродно, 1913.
11. Обзор Гродненской губернии за 1913 год. Гродно, 1914.
12. Ветеринарская хроника Витебской губернии. 1913. № 3—4.
13. Вестник Могилевского земства. 1914. № 10.
14. *Радцыг А. А.* Скотоводство и молочное хозяйство в разных странах. СПб., 1899.

Груды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. СПб., 1903. Вып. 11.

Обзор Витебской губернии за 1906 год.

Молочное хозяйство и скотоводство. 1912.

*Бейлькин Х. Ю.* Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861—1914 гг. Мн., 1989.

Приложение ко всеподданейшему отчету Витебского губернатора за 1883 год. Витебск, 1884. Ведомость № 2.

Памятная книжка Гродненской губернии на 1885 год. Гродно, 1884. Ч. 2.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1914 год. Могилев, 1914. Ч. 3.

Обзор Виленской губернии на 1909 год. Вильно, 1910. Приложение. Ведомость № 2.

*Summary*

*In the article the author analyzes the development of milk production he estates of the nobility during post-reform period. The author showed at the beginning of the XXth century this branc had become one of leading in landowners' farming.*